Created in Master PDF Editor - Demo Version

# Весці БДПУ

Штоквартальны навукова-метадычны часопіс.
Выдаецца з чэрвеня 1994 г.

**№ 4(98) 2018**

СЕРЫЯ 2. Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія. Эканоміка. Культуралогія

*Галоўны рэдактар* А. І. Жук

*Рэдакцыйная калегія:*
А. П. Жытко (нам. галоўнага рэдактара) (Рэспубліка Беларусь)
Т. М. Буйко (Рэспубліка Беларусь)
Л. М. Давыдзенка (Рэспубліка Беларусь)
А. В. Данільчанка (Рэспубліка Беларусь)
Г. У. Карзенка (Рэспубліка Беларусь)
І. В. Катляроў (Рэспубліка Беларусь)
В. Б. Келер (Федэратыўная Рэспубліка Германія)
В. В. Кірылаў (Расійская Федэрацыя)
А. Я. Кучко (Рэспубліка Беларусь)
А. С. Лапцёнак (Рэспубліка Беларусь)
А. М. Люты (Рэспубліка Беларусь)
У. Ф. Мартынаў (Рэспубліка Беларусь)
У. А. Мельнік (Рэспубліка Беларусь)
Я. Міраповіч (Рэспубліка Польшча)
Р. К. Мірзаханян (Рэспубліка Арменія)
А. І. Смолік (Рэспубліка Беларусь)
А. Г. Субоцін (Рэспубліка Беларусь)
А. Г. Шваб (Украіна)
А. М. Эскрыдж-Космач (Злучаныя Штаты Амерыкі)

*Адрас рэдакцыі:*
Вул. Магілёўская, 37, пакой 124,
220007, Мінск,
тэл. 219-78-12
*e-mail*: vesti@bspu.by

Пасведчанне № 1353 ад 06.05.10.
Міністэрства інфармацыі
Рэспублікі Беларусь

Падпісана ў друк 19.12.18.
Фармат 60×84 $^1/_8$. Папера афсетная.
Гарнітура *Арыял*. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 13,89. Ул.-выд. арк. 16,28.
Тыраж 100 экз. Заказ 676.

*Выдавец і паліграфічнае выкананне:*
Установа адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца друкаваных выданняў
№ 1/236 ад 24.03.14.
Ліцэнзія № 02330/448 ад 18.12.13.
Вул. Савецкая, 18,
220030, Мінск.

*Адказны сакратар* В. П. Андрыевіч
*Рэдактар* В. П. Андрыевіч
*Камп'ютарная вёрстка* В. С. Яворскай

© Весці БДПУ. Серыя 2. 2018. № 4

✧ ✧ ✧

У адпаведнасці з загадам Вышэйшай атэстацыйнай камісіі ад 02.02.2011 г. № 26 часопіс «Весці БДПУ. Серыя 2» уключаны ў Пералік навуковых выданняў Рэспублікі Беларусь для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў па гістарычных, культуралагічных, палітычных, сацыяльных, філасофскіх, эканамічных (эканамічная тэорыя) навуках

*Часопіс «Весці БДПУ. Серыя 2» у адпаведнасці з Пастановай ВАКа ад 08.06.2009 № 3 выходзіць:*
№ 1, 3 па навуковых кірунках «Паліталогія», «Сацыялогія», «Эканоміка»;
№ 2, 4 па навуковых кірунках «Гісторыя», «Філасофія», «Культуралогія»

✧ ✧ ✧ ✧ ✧ ✧

У адпаведнасці з дагаворам
паміж БДПУ і ТАА «Навуковая электронная бібліятэка» (ліцэнзійны дагавор № 676-12/2016 ад 21.12.2016 г.)
часопіс «Весці БДПУ» (у 3-х серыях) размяшчаецца на платформе eLIBRARY.RU і ўключаны ў Расійскі індэкс навуковага цытавання (РІНЦ) – бясплатны агульнадаступны інструмент вымярэння публікацыйнай актыўнасці вучоных і арганізацый.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Created in Master PDF Editor - Demo Version

Created in Master PDF Editor - Demo Version

П. А. Мацюш,
кандыдат гістарычных навук, дацэнт, загадчык навукова-даследчым сектарам БДПУ

УДК 930.85”18/19”

ФАРМІРАВАННЕ КАНЦЭПЦЫІ ІНДУСТРЫЯЛЬНАГА ГРАМАДСТВА Ў САЦЫЯЛЬНЫХ НАВУКАХ XIX – XX стст.

P. Matsiush, Candidate of History, Associate Professor, Head of scientific and research sector of BSPU

UDC 930.85”18/19”

FORMATION OF THE CONCEPT OF INDUSTRIAL SOCIETY IN SOCIAL SCIENCES OF THE XIX – XX CENTURIES

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У артыкуле аналізуюцца розныя аспекты фарміравання канцэпцыі індустрыяльнага грамадства ў працах найбольш вядомых навукоўцаў-грамадазнаўцаў XIX – XX стст. Аўтар акцэнтуе ўвагу на вывучэнні працэсаў сацыяльна-эканамічнай, палітычнай і духоўнай трансфармацыі чалавечага грамадства ў даследаваннях вядучых сацыёлагаў, гісторыкаў, філосафаў, эканамістаў, што дазволіла сфармуляваць сістэмнае разуменне грамадскіх працэсаў, выявіць сутнасць і адметныя рысы грамадства новага тыпу, для якога характэрны: падзел працы і рост яго прадукцыйнасці, высокі ўзровень канкурэнцыі, паскоранае развіццё прадпрымальніцкага рэсурсу і чалавечага капіталу, развіццё грамадзянскай супольнасці, шырокае развіццё сродкаў масавай камунікацыі, рост якасці жыцця. Аўтар сцвярджае, што фарміраванне індустрыяльнага грамадства адбываецца ў ходзе прамысловай рэвалюцыі, якая стала прычынай разгорнутай сацыяльнай і духоўна-культурнай трансфармацыі

Created in Master PDF Editor - Demo Version

Created in Master PDF Editor - Demo Version

*Ключавыя словы:* індустрыяльнае грамадства, капіталізм, канцэпцыя, прадпрымальніцтва, сацыяльная трансфармацыя, сацыяльныя навукі, тыпалагізацыі, традыцыйнае грамадства, урбанізацыя, фабрычная вытворчасць

Various aspects of industrial society concept formation in the works of the most famous social scientists of the nineteenth and twentieth centuries are analyzed in the article. The author focuses on the study of the processes of socio-economic, political and spiritual transformation of human society in the researches of leading sociologists, historians, philosophers, economists, that allowes to formulate a systematic understanding of social processes, to reveal the essence and distinctive features of a new type of society, which is characterized by: the division of labor and increase its productivity, high levels of competition, accelerate the development of enterprise resource and human capital, development of civil community, extensive development of mass communication, the growth of life quality. The author states that the formation of industrial society takes place during the Industrial Revolution, which has caused an expanded process of social, spiritual and cultural transformation

*Key words:* industrial society, capitalism, concept, entrepreneurship, social transformation, social sciences, typology, traditional society, urbanization, factory production

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*Уводзіны.* Грамадства як сістэма не з’яўляецца статычным. Яно змяняецца ў працэсе гістарычнага развіцця, што адкрывае магчымасці для вылучэння розных яго тыпаў на аснове істотных прыкмет і адметных асаблівасцей.

Працэс фарміравання грамадства новага тыпу, які ўступіў у актыўную фазу з другой паловы XVIII ст., паступова становіцца прадметам даследавання сацыёлагаў, гісторыкаў, філосафаў, эканамістаў. Прадстаўнік

Created in Master PDF Editor - Demo Version

Created in Master PDF Editor - Demo Version

кожнай з навук імкнуўся прааналізаваць сучасныя яму і папярэднія грамадскія працэсы, сфармуляваць іх сістэмнае разуменне. Вынікі праведзеных даследаванняў былі адлюстраваны ў адпаведных канцэпцыях.

Мэта дадзенага артыкула – прааналізаваць працэс фарміравання канцэпцыі індустрыяльнага грамадства ў працах найбольш вядомых навукоўцаў-грамадазнаўцаў XIX – XX стст., якія займаліся праблемамі тыпалагізацыі грамадскіх сістэм.

*Асноўная частка.* Яшчэ ў сярэдзіне XIX ст. К. Маркс прапанаваў сваю тыпалогію грамадства, якая зыходзіць з галоўнай ролі спосабу вытворчасці ў пэўнай грамадска-эканамічнай фармацыі. Савецкія гісторыкі за аснову перыядызацыі бралі менавіта гэтую тэорыю. Аднак у змяніўшыхся грамадска-палітычных умовах у 90-я гг. XX ст. многія даследчыкі адмовіліся ад марксісцка-ленінскай метадалогіі і ў пошуках новых метадалагічных падыходаў звярнуліся да іншых канцэпцый, распрацаваных яшчэ ў XIX ст.

Так, на працягу XIX – пачатаку XX ст. у заходняй сацыялогіі сфарміраваліся новыя падыходы да перыядызацыі грамадства (А. Сен-Сімон, А. Конт, Г. Спенсер, Э. Дзюркгейм, М. Вебер, А. Тойнбі і інш.). Навукоўцы вылучалі традыцыйнае грамадства з аграрным укладам і традыцыйнымі сацыяльнымі структурамі і індустрыяльнае грамадства – тып грамадскай арганізацыі, у якой індустрыяльная вытворчасць з’яўляецца асновай эканамічнага жыцця.

У другой палове XX ст. была сфармулявана ўжо трохступеньчатая тыпалогія грамадства, якая ўключала аграрную, індустрыяльную і постіндустрыяльную стадыі (Д. Бел, Р. Арон, І. Шумпетэр, Ж. Фурасцье, У. Растоў і інш.).

Такім чынам, з пункту гледжання апісанай мадэлі развіцця гісторыю чалавечага грамадства можна было падзяліць на тры няроўных па працягласці, але аднолькава важных этапаў. Улічваючы нераўнамернасць развіцця розных рэгіёнаў, усе тры тыпы грамадства прадстаўлены ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Created in Master PDF Editor - Demo Version

Created in Master PDF Editor - Demo Version

цяперашні час у свеце. Пры гэтым на індустрыяльнай стадыі развіцця ўсё яшчэ знаходзіцца значная частка чалавецтва [1, с. 3–4].

Як вядома, пераход да індустрыяльнага грамадства адбыўся дзякуючы прамысловай рэвалюцыі. Яе радзімай прынята лічыць Вялікабрытанію. Па словах брытанскага гісторыка А. Тойнбі «сутнасць прамысловага перавароту заключалася ў замене сярэднявечнай сістэмы рэгламентацыі, якой былі падпарадкаваныя вытворчасць і размеркаванне багацця, канкурэнцыяй» [2, с. 121].

Перадумовамі дадзенай з'явы можна лічыць паспяховыя палітычныя рэвалюцыі XVII ст. у Англіі, якія ператварылі гэтую краіну ў канстытуцыйнай манархію і адкрылі бесперашкодныя шляхі для развіцця капіталізму [3, с. 139].

Сучасны англійская даследчык Р. Ален адзначае, што ў сярэдзіне XVIII ст. у Вялікабрытаніі, у параўнанні з астатнімі краінамі Еўропы і Азіі, заробкі былі высокімі, а капітал і энергія таннымі. У выніку тагачасныя прарыўныя тэхналогіі – паравы рухавік, бавоўнапрадзільная фабрыка і замена драўнянага паліва вуглём у металургіі – сталі прыбытковымі толькі ў Вялікабрытаніі і стратнымі за яе межамі. Пасля таго, як брытанскія інжынеры зрабілі свае новыя тэхналогіі больш эканамічна эфектыўнымі, прамысловая рэвалюцыя распаўсюдзілася па ўсім свеце, паклаўшы пачатак зараджэнню індустрыяльнага грамадства [4, с. 11–12].

Сам тэрмін «індустрыяльнае грамадства» упершыню быў уведзены ва ўжытак французскім філосафам і сацыёлагам Анры Сен-Сімонам.

Ён разглядаў гісторыю грамадства як працэс, у якім адбываецца змена аднаго перыяду іншым, больш высокага ўзроўню. Ідэі натуральнага парадку класічнай школы ён супрацьпаставіў ідэю развіцця. Сен-Сімон вылучаў наступныя гістарычныя формы грамадства:

– дзікунства;

– антычнасць;

– феадалізм;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Created in Master PDF Editor - Demo Version

Created in Master PDF Editor - Demo Version

– капіталізм;

– індустрыялізм.

Аснову ўсіх гістарычных формаў грамадства, сцвярджаў вучоны, складалі адносіны ўласнасці, а галоўным фактарам грамадскага развіцця ён лічыў розум.

Сен-Сімон быў перакананым прыхільнікам пераходу ад капіталізму да новага грамадскаму ладу. Гэты лад ён называў індустрыялізмам, пераход да якога вызначаўся патрабаваннямі прагрэсу і з’яўляўся гістарычнай неабходнасцю.

Асноўная супярэчнасць сучаснага грамадства Сен-Сімон бачыў у супрацьстаянні «тэалагічнай і феадальнай сістэмы», «навуковай і індустрыяльнай сістэмы», барацьбе класаў дваран, «індустрыялаў» (прадпрымальнікі, рабочыя, рамеснікі, сяляне і інш.) і прамежкавых паміж німі «буржуа» (юрысты, ваенныя, землеўладальнікі і інш.). Дваране па Сен-Сімону з’яўляліся нашчадкамі заваёўнікаў франкаў, «індустрыялы» – заваяваных галаў [5, с. 3–8].

Услед за Сэн-Сімонам «індустрыяльным» сучаснае яму грамадства называў А. Конт. Ён сфармуляваў асноўныя прынцыпы функцыянавання такога грамадства:

– навуковая арганізацыя працы і максімальная яе выніковасць;

– максімальнае раскрыццё чалавечых рэсурсаў на аснове навуковай арганізацыі працы;

– фарміраванне новага грамадскага феномену – працоўнага класу на падставе імклівага развіцця прамысловасці;

– ўзнікненне супярэчнасцей паміж пралетарыямі і прадпрымальнікамі (капіталістамі);

– з’яўленне сацыяльна-эканамічных крызісаў з-за перавытворчасці, следствам якіх становіцца беднасць сярод багацця;

– свабода тавараабмену і пагоня за прыбыткам з боку прадпрымальнікаў [6].

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Created in Master PDF Editor - Demo Version

Created in Master PDF Editor - Demo Version

У залежнасці ад вызначэння важнасці кожнай з гэтых асаблівасцей фармаваліся розныя палітычныя плыні: лібералізм і сацыялізм.

Так, сацыялісты вырашальнае значэнне надавалі чацвёртай і пятай асаблівасцям: канфлікту паміж працай, капіталам і беднасцю значнай часткі насельніцтва. Крызісны стан вытворчасці разглядаўся як заканамернае следства капіталізму. На гэтым сцвярджэнні К. Маркс засноўваў сваю тэорыю капіталізму і сацыялістычнай рэвалюцыі.

К. Маркс даказвае, што капіталістычнае грамадства непазбежна павінна загінуць, што буржуазныя вытворчыя адносіны стануць апошняй антаганістычнай формай грамадскага працэсу вытворчасці, а сацыялістычны грамадскі лад будзе вольным ад антаганізмаў класавага грамадства.

Погляды К. Маркса знайшлі адлюстраванне ў адпаведнай канцэпцыі. Яе сутнасць заключалася ў сцвярджэнні першачарговай ролі спосабу вытворчасці ў пэўнай грамадска-эканамічнай фармацыі (першабытнаабшчыннай, рабаўладальніцкай, феадальнай і капіталістычнай). Усе яны прадстаўлялі сабой перадгісторыю развіцця чалавечага грамадства, якое дасягае свайго поўнага росквіту толькі ў грамадстве пятага тыпу – сацыялістычным, дзе адкрываліся магчымасці для ўсебаковага развіцця чалавека як асобы [7, с. 10].

Такім чынам, асновай ўсіх сацыяльных і духоўна-культурных пераўтварэнняў К. Маркс лічыў эканамічны базіс грамадства.

Аспрэчваючы эканамічны дэтэрмінізм К. Маркса, яго суайчыннік М. Вебер генезіс капіталізму і індустрыяльных адносін звязваў з двума фактарамі неэканамічнага характару. Першы – гэта інавацыйнае стаўленне да гаспадарання. Пад ім ён разумеў пэўны адыход ад традыцыйнай натуральнай гаспадаркі да таварных адносін. Другой умовай з’яўлення грамадства новага тыпу Вебер называў пратэстанцкую этыку. Пратэстанцкая этыка адносін да працы стварыла ўмовы для павелічэння тавару, ператварэння рамеснай вытворчасці ў мануфактурную і затым фабрычную. Эканамічны рост і

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Created in Master PDF Editor - Demo Version

Created in Master PDF Editor - Demo Version

навуковыя пошукі ў галіне ўдасканалення прылад працы прывялі да новых сацыяльных адносін і да новага сацыяльнага ладу.

Такім чынам, з пункту гледжання тэорыі М. Вебера, зараджэнне капіталізму і індустрыяльных адносін не мелі жорсткай эканамічнай абумоўленасці. Прыярытэт вучоны аддаваў нематэрыяльным фактарам, і ў першую чаргу, рэлігійнай этыцы [8].

На думку англійскага сацыёлага Г. Спенсера індустрыяльнае грамадства магло сфармавацца толькі ў мірных умовах. Яно ўяўляла сабой поўную супрацьлегласць ваеннаму. У грамадстве, дзе доўгі час не было вайны, непазбежна слабеў прымус, ўзрасталі гнуткасць і мабільнасць сацыяльнай арганізацыі. Ва ўмовах індустрыяльнага грамадства людзі не былі прывязаныя да аднаго месца або занятку. Яны маглі свабодна выбіраць сферу дзейнасці без шкоды для сацыяльнай інтэграцыі. Калі ў ваенным грамадстве людзей аб’ядноўвалі сілай, то ў індустрыяльным грамадстве сацыяльная салідарнасць грунтавалася на ведах і добраахвотным супрацоўніцтве. Іншымі адметнымі характарыстыкамі індустрыяльнага грамадства, па Спенсеру, з’яўляліся дэцэнтралізацыя, дазвольнае права (дазволена ўсё, што не забаронена законам), прыярытэт правоў асобы замест культу ўлады. Сацыяльна значнымі рысамі асобы ў індустрыяльным грамадстве станавіліся індывідуалізм і прадпрымальнасць [9].

Працэс фарміравання індустрыяльнага грамадства ставіў пытанне аб новай парадыгме грамадскіх адносін, у тым ліку суадносінах індывідуальнага і грамадскага.

У прыватнасці гэтай праблеме прысвяціў свае даследаванні Э. Дзюркгейм. Ён займаўся вывучэннем працэсу сацыялізацыі чалавека ва ўмовах індустрыяльнага грамадства. Чалавек, на думку Э. Дзюркгейма, – «гэта арганізм, які існуе і развіваецца ў сацыяльнай рэальнасці і нават у ходзе індывідуалізацыі рэалізуе сацыяльныя нормы і «ўбудоўваецца» ў сацыяльныя структуры. Узнікненне феномену чалавечай асобы ўяўлялася Э. Дзюркгейму выключнай заслугай грамадскага развіцця і сацыялізуючага ўздзеяння

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Created in Master PDF Editor - Demo Version

Created in Master PDF Editor - Demo Version

індустрыяльнага грамадства». Асабістыя якасці індывіду, на яго думку, выцякалі толькі з аб’ектыўна існуючых грамадскіх якасцей, якія рэгулявалі закладзеныя прыродай псіхічныя чалавечыя ўласцівасці. Э. Дзюркгейм сцвярджаў, што індустрыяльнае грамадства спрыяла развіццю індывідуальнасці, а традыцыйнае перашкаджала гэтаму працэсу [10].

Адным з праяў індывідуальнасці ў індустрыяльным грамадстве можна лічыць прадпрымальніцкі талент.

Менавіта прадпрымальніцкі рэсурс у якасці вядучага фактару грамадскага развіцця ўпершыню прапанаваў нямецкі даследчык І. Шумпетэр. Прадпрымальнік, згодна І. Шумпетэру, – гэта гаспадарчы суб’ект, функцыяй якога з’яўляецца ўкараненне навацый. Прадпрымальніцтва, па Шумпетэру, не з’яўляецца прафесіяй. Наватарская функцыя прадпрымальніка адрознівае яго ад функцыі капіталіста, так як прадпрымальнік не абавязкова валодаў правам маёмасці.

Прадпрымальніцтва патрабуе пастаяннага выкарыстання творчага падыходу, веру ва ўласныя сілы, уменне рызыкаваць. Іншымі словамі рысы асобы, якія характарызуюць прадпрымальніка, не вызначаліся класавай ці сацыяльнай прыналежнасцю [11, с. 312–324].

Асаблівая роля прадпрымальніцтва падкрэсліваў і амерыканскі сацыёлаг Т. Парсанс. Вучоны сцвярджаў, што прамысловая рэвалюцыя здзейснілася ва ўмовах сістэмы «вольнага прадпрымальніцтва», і спарадзіць яе не магла ніякая кардынальна іншая сістэма [12, с. 107].

У ХХ ст. канцэпцыю індустрыяльнага грамадства развіў французскі вучоны Жан Фурасцье у кнізе «Вялікая надзея ХХ стагоддзя» (1949). У гісторыі чалавецтва ён вылучыў дзве асноўныя стадыі: перыяд традыцыйнага грамадства (ад новага каменнага веку да XVIII ст.) і перыяд індустрыяльнага грамадства (ад XVIII ст. да цяперашняга часу).

Асноўную ўвагу Ж. Фурасцье надаў індустрыяльнаму грамадству, якое, на яго думку, кардынальна адрозніваецца ад традыцыйнага дынамічным развіццём на падставе тэхнічнага прагрэсу. І гэты прагрэс змяняе як

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Created in Master PDF Editor - Demo Version

Created in Master PDF Editor - Demo Version

вытворчасць, так і грамадства ў цэлым. Ён забяспечвае не толькі значнае павышэнне агульнага ўзроўню жыцця, але і выраўноўвае стан усіх слаёў грамадства. У выніку ў індустрыяльным грамадстве знікаюць немаёмныя класы. Тэхнічны прагрэс, на думку Ж. Фурасцье, здольны вырашыць усе сацыяльныя праблемы, што значна зніжала пагрозу сацыяльнай рэвалюцыі.

Даследаванне феномена індустрыяльнага грамадства было працягнута ў працах іншага французскага мысліцеля – Раймона Арона. Уласную канцэпцыю індустрыяльнага грамадства ён грунтоўна выклаў у працы «Васямнаццаць лекцый аб індустрыяльным грамадстве» (1962) і шэрагу наступных прац.

Ж. Фурасцье вылучаў два асноўныя стадыяльныя тыпы чалавечага грамадства: традыцыйны (аграрны) і індустрыяльны (рацыянальны). Для першага з іх характэрна дамінаванне земляробства і жывёлагадоўлі, натуральнай гаспадаркі, існаванне саслоўяў, аўтарытарны спосаб кіравання, для другога – панаванне прамысловай вытворчасці, рынак, роўнасць грамадзян перад законам і дэмакратыя. Пераход ад традыцыйнага грамадства да індустрыяльнага быў істотным прагрэсам ва ўсіх адносінах. Як і Ж. Фурасцье, Р. Арон надаваў вялікае значэнне развіццю тэхнікі, якое, на яго думку, павінна было забяспечыць рашэнне ўсіх сацыяльных праблем [13].

Уласны ўклад у тэорыю грамадскага развіцця ўнёс У. Растоў у другой палове XX ст.

Замест прапанаванага К. Марксам прынцыпу выдзялення стадый развіцця па спосабах вытворчасці, Растоў прапанаваў ўлічваць іншыя эканамічныя крытэрыі – тэхналагічныя інавацыі, хуткасць эканамічнага росту, змены ў структуры вытворчасці і г.д.

Па ўзроўні тэхналагічнага развіцця Растоў вылучыў пяць этапаў развіцця грамадства:

1) «традыцыйнае грамадства» – прымітыўная і застойная сельскагаспадарчая вытворчасць з ужываннем ручной тэхнікі, іерархічная сацыяльная структура, улада землеўладальнікаў і інш.;

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

Created in Master PDF Editor - Demo Version

Created in Master PDF Editor - Demo Version

2) «пераходнае грамадства» – стварэнне перадумоў для рэзкага паскарэння тэмпаў эканамічнага росту: у вытворчасці пачынаюць прымяняцца новыя тэхналагічныя адкрыцці, павялічваюцца капіталаўкладанні, з'яўляецца «новы тып прадпрымальных людзей», узнікае цэнтралізаванае дзяржава;

3) «узлёт» – перыяд прамысловага перавароту, вядучага да павышэння долі назапашвання капіталу (капіталаўкладанні растуць з 5 да 10% нацыянальнага даходу) і рэзкага эканамічнаму росту (асабліва хутка ў прамысловасці), радыкальнага змянення метадаў вытворчасці. Менавіта гэтая непрацяглая, але выключна дынамічная фаза – ключавая ў пераходзе ад даіндустрыяльнага да індустрыяльнага грамадства;

4) «сталасць» – бурнае развіццё прамысловасці, далейшае павышэнне ўзроўню капіталаўкладанняў (да 20% нацыянальнага даходу), шырокае ўкараненне дасягненняў навукі і тэхнікі, рост гарадскога насельніцтва да 60–90%, павелічэнне долі кваліфікаванай працы;

5) эра «высокага масавага спажывання» – асноўнай праблемай грамадства становіцца праблемы спажывання, таму галоўнымі галінамі эканомікі выступаюць сфера паслуг і вытворчасць тавараў масавага спажывання, узнікае новы сярэдні клас і «дзяржава ўсеагульнага дабрабыту».

У сваёй больш позняй працы «Палітыка і стадыі росту» (1971) ён дадаў да раней вылучаных пяці стадыям шостую – стадыю «пошуку якасці жыцця», калі на першы план вылучаецца духоўнае развіццё чалавека [14].

*Заканчэнне.* Такім чынам, на працягу XIX – XX стст. адбываецца інтэнсіўнае развіццё індустрыяльнага грамадства. Прадстаўнікамі розных сацыяльных навук былі глыбока вывучаны працэсы сацыяльна-эканамічнай, палітычнай і духоўнай трансфармацыі, што дазволіла выявіць сутнасць і характэрныя рысы грамадства новага тыпу і на аснове гэтага сфармуляваць адпаведную канцэпцыю. Да асноўных палажэнняў названай канцэпцыі можна аднесці наступныя:

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Created in Master PDF Editor - Demo Version

Created in Master PDF Editor - Demo Version

• замена завода мануфактурай, што прывяло да нябачанага раней росту прадукцыйнасці грамадскай працы;

• пераразмеркаванне рабочай сілы: занятасць насельніцтва ў сферы сельскай гаспадаркі скарачаецца, за кошт чаго ўзрастае доля яго занятасці ў прамысловасці, гандлі і іншых нясельскагаспадарчых сферах занятасці, што вядзе да росту долі гарадскога насельніцтва;

• ўкараненне ў вытворчасць машын і механізмаў прывяло да скарачэння працоўных месцаў, але дэмаграфічны выбух і ўдасканаленне транспартнай інфраструктуры выклікалі рост мабільнасці насельніцтва;

• змены ў сацыяльнай структуры індустрыяльнага грамадства (сфармаваліся буржуазія, прамысловы пралетарыят і так званае новае дваранства);

• стварэнне спецыфічнай сістэмы каштоўнасцей, якая ўключала індывідуалізм, матэрыяльны дабрабыт, камфорт і інш.;

• развіццё грамадзянскай супольнасці і сістэм кіравання ўсіх узроўняў, шырокае развіццё сродкаў масавай камунікацыі, рост якасці жыцця;

• паскоранае развіццё прадпрымальніцкага рэсурсу і чалавечага капіталу.

Такім чынам, фарміраванне індустрыяльнага грамадства адбываецца ў ходзе прамысловай рэвалюцыі, якая прывяла да шырокай сацыяльнай трансфармацыі і вызначыла чарговы этап развіцця чалавечай цывілізацыі.

ЛІТАРАТУРА

1. *Алексаха, А. Г.* Введение в прогрессиологию. Теоретические проблемы экономической истории. – М.: Горячая линия – Телеком, 2004. – 288 с.
2. *Тойнби, А.* Промышленный переворот в Англии в XVIII столетии : Пер. с англ. / Предисл. А. И. Чупрова. Изд. Стереотип. М.: Книжный дом «ЛИБРОКОМ», 2015. – 352 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Created in Master PDF Editor - Demo Version

Created in Master PDF Editor - Demo Version

3. *Гринин, Л. Е.* Производительные силы и исторический процесс. – Изд. 2-е, перераб. и доп. – Волгоград: ФГУП «ИПК «Царицын», 2003. – 272 с.
4. *Аллен, Р. С.* Британская промышленная революция в глобальной картине мира / пер. с англ. Н. В. Автономовой ; науч. ред. перевода В. С. Автономов. – М.: Изд-во Института Гайдара, 2014. – 448 с.
5. *Сен-Симон, А.* Катехизис промышленников / А. Сен-Симон. Катехизис промышленников, или система позитивной политики / О. Конт: пер. с фр. Изд. 2-е. М.: Книжный дом «ЛИБРОКОМ», 2011. – 176 с.
6. Теория индустриального общества О. Конта – [Электронный ресурс]. Режим доступа : https://xstud.ru/17014/sotsiologiya/teoriya_industrialnogo_obschestva_konta – Дата доступа : 14.06.2018.
7. *Маркс, К.* Сочинения / К. Маркс, Ф. Энгельс. – 2-е изд. – Москва: Госуд. изд-во полит. лит., 1959. – Т. 13: К критике политической экономии. – 805 с.
8. Понимающая социология Макса Вебера. [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http: // socioline.ru/pages/ponimayuschaya-sotsiologiya-maksa-vebera. – Дата доступа : 09.06.2018.
9. *Окатов, А. В.* Типология и эволюция общества в социологической концепции Г. Спенсера / А. В. Окатов // Вестник Тамбовского университет. Серия: Гуманитарные науки. 2014. – Вып. 10. – С. 32–39.
10. Концепция индивидуальной свободы в теории Э. Дюркгейма. [Электронный ресурс]. – Режим доступа : https : // sites.google.com/site/ekadumova/home/koncepcia-individualnoj svobody-v-teorii-e-durkgejma. – Дата доступа : 09.06.2018.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Created in Master PDF Editor - Demo Version

Created in Master PDF Editor - Demo Version

11. *Базилевич, В. Д.* 12. 1. 2 Неортодаксальна теорія Й. А. Шумпетера // Історія економічних учень: У 2 ч.. – 3-е издание. – К.: Знання, 2006. – Т. 2. – 575 с.
12. *Парсонс, Т.* Система современных обществ / Т. Парсонс. – М.: Аспект Пресс, 1998. – 270 с.
13. Концепции индустриального общества. [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://storyo.ru/filo/17_03.htm. – Дата доступа : 28.01.2018.
14. *Латова, Н.* Ростоу, Уолт Уитмен. / Н. Латова. – [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://www.krugosvet.ru/enc/gumanitarnye_nauki/sociologiya/ROSTOU_UOLT_UITMEN.html – Режим доступа : http://pdf.kamunikat.org/2181-6.pdf. – Дата доступа : 14.06.2018.

REFERENCES

1. *Aleksakha, A. G.* Vvedeniye v progressiologiyu. Teoreticheskiye problemy ekonomicheskoy istorii. – M .: Goryachaya liniya – Telekom, 2004. – 288 s.
2. *Toynbi, A.* Promyshlennyy perevorot v Anglii v XVIII stoletii: Per. s angl. / Predisl. A. I. Chuprova. Izd. Stereotipy. M .: Knizhnyy dom «LIBROKOM», 2015. – 352 s.
3. *Grinin, L. Ye.* Proizvoditel’nyye sily i istoricheskiy protsess. – Izd. 2-ye, pererab. i dop. – Volgograd: FGUP «IPK «Tsaritsyno», 2003. – 272 s.
4. *Allen, R. S.* Britanskaya promyshlennaya revolyutsiya v global'noy kartine mira / per. s angl. N. V. Avtonomovoy; nauchu. red. Perevoda V. S. Avtonomov. - M .: Izd-vo Instituta Gaydara, 2014. – 448 s.
5. *Sen-Simon, A.* Katekhizis promyshlennikov / A. Sen-Simon. Katekhizis promyshlennikov, ili sistema pozitivnoy politiki / O. Kont: per. s fr. Izd. 2-ye. M .: Knizhnyy dom «LIBROKOM», 2011. – 176 s.
6. Teoriya industrial'nogo obshchestva O. Konta – [Elektronnyy resurs]. Rezhim dostupa:

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Created in Master PDF Editor - Demo Version

Created in Master PDF Editor - Demo Version

https://xstud.ru/17014/sotsiologiya/teoriya_industrialnogo_obschestva_konta. – Data dostupa: 14.06.2018.

7. *Marks, K.* Sochineniya / K. Marks, F. Engel’s. – 2-ye izd. – Moskva: gosud. izda-vo polit. lit., 1959. – T. 13: K Kritike politicheskoy ekonomii. – 805 s.
8. Ponimayushchaya sotsiologiya Maksa Vebera. [Elektronnyy resurs]. – Rezhim dostupa: http: // socioline.ru/pages/ponimayuschaya-sotsiologiya-maksa-vebera. – Data dostupa: 09.06.2018.
9. *Okatov, A. V.* Tipologiya i evolyutsiya obshchestva v sotsiologicheskoy kontseptsii G. Spensera / A. V. Okatov // Vestnik Tambovskogo universiteta. Seriya: Gumanitarnyye nauki. 2014. – Vyp. 10. – S. – 32–39.
10. Kontseptsiya individual'no svobody v teorii E. Dyurkgeyma. [Elektronnyy resurs]. – Rezhim dostupa: https: // sites.google.com/site/ekadumova/home/koncepcia-individualnoj-svobody-v-teorii-e-durkgejma. – Data dostupa: 09.06.2018.
11. *Bazilevich, V. D.* 12. 1. 2 Neortodaksal’na Teorema Y. A. Shumpetera // Istoriya yekonomichnikh uchenykh: V 2 ch. – 3-ye izdaniye. – K .: znaniyem, 2006. – T. 2. – 575 s.
12. *Parsons, T.* Sistema sovremennykh obshchestva / T. Parsons. – M .: Aspekt Press, 1998. – 270 s.
13. Kontseptsii industrial’nogo obshchestva. [Elektronnyy resurs]. – Rezhim dostupa: http://storyo.ru/filo/17_03.htm. – Data dostupa: 28.01.2018.
14. *Latova, N.* Rostou, Uolt Uitmen. / N. Latova. – [Elektronnyy resurs]. – Rezhim dostupa: http://www.krugosvet.ru/enc/gumanitarnye_nauki/sociologiya/ROSTOU_UOLT_UITMEN.html – Rezhim dostupa: http://pdf.kamunikat.org/2181-6.pdf. – Data dostupa: 14.06.2018.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Created in Master PDF Editor - Demo Version